ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
9
САКАВІКА
№ 8(1601)

Матэрыялы, прысвечаныя мінуламу будатрадаўскаму лету, чытайце ў сённяшнім нумары.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

Самая цудоўная

ДУМАЮ, мой падарунак парадуе вас. На гэтай касеце — запіс дзвюх перадач, дзе ішла размова аб салідарнасці і супрацоўніцтве паміж Саюзам Кангалезскай Сацыялістычнай Моладзі (СКСМ) і ВЛКСМ, арганізаваных экспертамі ВЛКСМ пры Цэнтральным камітэце нашай маладзёжнай арганізацыі. Я з задавальненнем яе рыхтаваў: мяне хвалюе ўсё, што звязана з Савецкім Саюзам, дзе я правёў не адзін год.

Сёння ганаруся тым, што вучыўся ў БДУ імя У. І. Леніна. Тут я атрымаў выдатныя веды, без якіх наўрад ці змог бы працаваць на такой пасадзе — адказным радыё і тэлевізійных маладзёжных перадач у аддзеле прэсы, прапаганды і інфармацыі Цэнтральнага камітэта СКСМ. Адначасова вяду штотыднёвую перадачу «Моладзь і рэвалюцыя». Кіраўніцтва арганізацыі моладзі і аўдыторыя «Галасы кангалезскай рэвалюцыі» — нашай нацыянальнай радыёстанцыі — задаволены маёй работай. І я ўдзячны, што не падвёў вас, сваіх педагогаў, якія так цярпліва вучылі мяне асновам маёй будучай прафесіі — журналістыкі.

А зараз некалькі слоў пра справы сямейныя. Дзеці мае Мюрэль, Галіна і Франшэль здаровыя. Зараз у нас холадна і ад гэтага пакутуюць усе, вядома, акрамя мяне. Калі Галіна ці Мюрэль здзіўляюцца, няўжо я сапраўды не баюся холаду, я кажу ім, што я загартаваны, бо да перамен надвор'я прывык у Савецкім Саюзе. І яны ў каторы раз пачынаюць пытаць, што гэта за краіна. А я з задавальненнем зноў і зноў паўтараю: «Самая цудоўная краіна ў свеце».

МАТУМОНА БОН-АНЭ
(Н. Р. КОНГА).

Чаму я завочнік?

Ёсць адна, магчыма, найважнейшая прычына.

Я не магу ўявіць сабе, як лекцыі, семінары і практычныя, нават праведзеныя на вышэйшым узроўні, могуць здзейсніць цуд па пераўтварэнню студэнта ў сапраўднага майстра. Напрыклад, на факультэце журналістыкі. Калі ж вучыцца пісаць? Ахвяруючы для творчасці лекцыйнымі гадзінамі? Ці паганяючы сябе ў нешматлікія адзінка-дні, якія выдзяляюць на дзённай форме навучання для працы ў рэдакцыі?

Не толькі атрыманнем дыплома аб вышэйшай адукацыі вабіць мяне завочны. Хутчэй за ўсё тым, што забяспечвае мне фінансавую незалежнасць і акрэслівае напрамкі пошуку ведаў. І мяркую: для чалавека, які мае ахвоту і жаданне быць адукаваным, гэтага дастаткова. Што ж можна выкладаць на дзённым журфаку ўсе пяць гадоў? Мне здаецца, хапіла б шасці агульнаадукацыйных семестраў і двухгадовай стажыроўкі пад наглядам выкладчыкаў-тэарэтыкаў і журналістаў-практыкаў, каб не было дыпламаваных непрафесіяналаў.

Пакуль гэта толькі мае мары на будучае. А цяпер я выслухаў меркаванні журфакаўцаў і парады супрацоўнікаў газет. І пайшоў на завочны...

ЮРЫЙ НАЯРОВІЧ,
студэнт І курса аддзялення журналістыкі завочнага факультэта.

ВЫБАРЫ І НАШ ВЫБАР

«Свае лепшыя гады я правёў ва універсітэце»

Міхаіл Іванавіч Дзямчук закончыў БДУ у 1968 годзе, атрымаўшы за выдатную вучобу на фізфаку дыплом з адзнакай. Потым ён працаваў загадчыкам кафедры, быў сакратаром партыйнага камітэта. 22 гады яго жыцця прайшлі ў Беларускім універсітэце.

І вось — новая сустрэча з роднай установай праз доўгі перапынак, цяпер ужо ў якасці Міністра народнай адукацыі БССР і кандыдата ў народныя дэпутаты СССР ад Усесаюзнага таварыства «Веды».

Вялікую аўдыторыю сабрала гэта сустрэча, быццам студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі, якія прыйшлі сюды, загадзя ведалі, што ім давядзецца пачуць не проста канкрэтную перадвыбарную платформу, а ўсхваляваную прамову зацікаўленага і дасведчанага чалавека.

— У наш час цяжка быць рэалістам і аптымістам адначасова, таму мы назіраем крайнасці ў розных перадвыбарных праграмах: ёсць сярод іх рэвалюцыйныя, а ёсць зусім канкрэтныя. Я буду гаварыць аб тым, што лічу галоўным сярод сённяшніх праблем. Прычына многіх трагедый нашага грамадства — недахоп агульнага адукацыйнага ўзроўню. Менавіта з-за дэфармацыі адносін да навукі, культуры мы маем сёння пэўны крызіс і ва ўсіх астатніх галінах. Таму нам неабходна стварыць сістэму нарошчвання адукацыйнага патэнцыялу і абавязкова знайсці механізм гэтага нарошчвання.

У аснове рэарганізацыі павінна быць новая канцэпцыя адукацыі, якая ўключае: перманентнасць, глыбокую дыферэнцыяцыю і дэмакратычнасць адукацыі, а таксама лагічнасць нашых адукацыйных структур.

Асабліва важна сёння састыкаваць пэўны рэгіён з вышэйшай школай, каб эканамічныя праблемы гэтай мясцовасці былі зфакусіраваны ў вучэбным працэсе ВНУ, якія тут знаходзяцца. Таму мы імкнемся зрабіць паўнакроўнымі нашы пераферыйныя навучальныя ўстановы і адначасова разгрузіць сталічныя. З гэтым звязана і надзённая неабходнасць ажыццявіць праграму перапрафіліравання навучальных устаноў, а частка кафедр і нават цэлых факультэтаў наогул павіна быць ліквідавана. Падлічана, што ў нас кожны чацвёрты, а пры больш пільным позірку, магчыма, і кожны другі, працуе не па спецыяльнасці, у тым ліку і па той жа прычыне — адсутнасці сувязей паміж патрэбамі рэгіёна і дзейнасцю ВНУ. У рэспубліцы зараз ёсць вучэбныя ўстановы, якія наогул на рэспубліку не працуюць.

Вельмі трывожнае ў БССР становішча і з суадносінамі паміж колькасцю інжынерных і гуманітарных спецыяльнасцей. Нам трэба павялічваць колькасць гуманітарыяў, у першую чаргу-сацыёлагаў, педагогаў, выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры.

Зараз кожнага з нас павінны турбаваць і праблемы дэмакратызацыі жыцця ВНУ. Безумоўна, у нас пакуль няма культуры дэмакратызацыі. Але працэс гэты пачаты, і ён незваротны.

Цяпер аб праблемах навукі. Чаму ў краінах Захаду яна развіваецца перш за ўсё ў ВНУ, а ў нас — у Акадэміі навук? Апошні год паказаў: ільготы, даплаты навуковым работнікам па-ранейшаму існуюць, але агульныя паказчыкі развіцця навукі знікаюцца. Усё менш нашых студэнтаў праяўляюць жаданне займацца навуковымі даследаваннямі, матэрыяльная база не вытрымлівае ніякай крытыкі. Гэта датычыцца і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. За кожны пункт існуючай пастановы Савета Міністраў БССР аб развіцці БДУ даводзіцца біцца. Я свядома абвастраю гэту праблему і ва ўрадзе, і ў ЦК. І сёння абяцаю вам, што пытанні развіцця універсітэта бяру з сабой як наказ ад вашага калектыву пасля гэтай сустрэчы.

Гаварыў Міхаіл Іванавіч і аб шляхах развіцця беларускай нацыянальнай школы, у тым ліку і аб тым, што зараз у некаторых ВНУ рэспублікі прадугледжаны ўступны экзамен па беларускай мове і літаратуры, а ў школах вывучэнне беларускай мовы будзе пачынацца ў першым класе.

Пазней ён атрымаў пытанне: ці не прывядзе ўвядзенне такога ўступнага экзамену да адтоку таленавітай моладзі з Беларусі ў іншыя рэспублікі? Міністр застаўся на сваіх пазіцыях:

— Так, гэта валявое рашэнне, але кардынальныя меры патрэбны, нават калі мы адчуем раптам, што памыліліся. Сітуацыя з нацыянальнай школай у рэспубліцы вельмі складаная.

Запісак з пытаннямі было шмат: і аб становішчы канкрэтнай маладой сям'і, і аб тым, што Дзямчук збіраецца рабіць у будучым як дэпутат для развіцця матэрыяльнай базы сярэдняй школы, і што, на яго думку, у першую чаргу трэба змяніць у нашым грамадстве.

Адказаў Міхаіл Іванавіч і на пытанні, што датычылі непасрэдна універсітэта. Ён запэўніў прысутных, што ў праекце новых будынкаў БДУ у Шчамысліцы не прадугледжана будаўніцтва склада ізатопаў, паведаміў, што пытанне аб новым памяшканні для філфака па-ранейшаму не вырашана. А яшчэ папярэдзіў аб магчымай у будучым праблеме для універсітэта: у сувязі з тым, што яго студэнты больш не будуць прызывацца ў армію (бо існуе ваенная кафедра), а сённяшнія салдаты хутка вернуцца ў аўдыторыі, ва універсітэце не хопіць месцаў. Міністр прапанаваў адзін са спосабаў прадугледзець такую магчымасць: пасля летняй сесіі выключыць з універсітэта непаспяваючых першакурснікаў.

На заканчэнне размовы сход прыняў рашэнне: падтрымаць кандыдатуру М. І. Дзямчука, адобрыць яго перадвыбарную праграму і даць кандыдату ў народныя дэпутаты наказ кантраляваць выкананне пастановы Савета Міністраў БССР аб развіцці матэрыяльнай базы БДУ і прымаць меры па павышэнню прыярытэту адукацыі ў краіне.





Фотарэпартаж з сустрэчы калектыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна з былым супрацоўнікам універсітэта, цяпер Міністрам народнай адукацыі БССР, кандыдатам у народныя дэпутаты СССР ад Усесаюзнага таварыства «Веды» Міхаілам Іванавічам Дзямчуком (на здымку ў цэнтры) вялі нашы карэспандэнты В. Бягун і С. Грыц (фота).

Мы прыйшлі ў гэты свет!

ПРАПАНУЕМ ПАЗНАЁМІЦЦА

І зноў «Шукальнікі»

Я ГЛЯДЗЕЛА на яго зграбныя, з тонкімі прадаўгаватымі пальцамі, рукі (менавіта такімі засталіся ў маім уяўленні рукі хірурга з дзяцінства) і ніяк не магла ўсвядоміць, што яны могуць не толькі ўмела карыстацца хірургічным інструментарыем, але і весці кладку, мяшаць цэмент, пілаваць, секчы, тынкаваць... І таксама не абы з рук, а добрасумленна, прафесійна. Пацвярджэнні? Колькі хочаце: вусныя і пісьмовыя ад кіраўніцтва саўгаса імя газеты «Правда», што знаходзіцца ў Джамбейцінскім раёне Уральскай вобласці. А самае пераканаўчае: гаспадарка не без дапамогі студэнтаў стала саўгасам-мільянерам. Тут амаль усе жывёлагадоўчыя, вытворчыя, жыллёва-бытавыя памяшканні пабудаваны рукамі байцоў студэнцкага атрада «Шукальнік» Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута.

Дружба гэта нарадзілася даўно. Праўда, дружбай адносіны паміж мясцовым «начальствам» і атрадам адразу нельга было назваць. Яна толькі пачыналася. З цяжкасцямі, шматлікімі перашкодамі, узаемнымі прэтэнзіямі. Давялося-такі паспрачацца аднойчы даволі прынцыпова — але ж нічога лішняга не патрабавалі — усяго толькі прыгодныя для жылля будынкі. Вымушаны былі нават ультыматум паставіць: калі не паселіце ў нармальных умовах, будзеце шукаць сабе іншы атрад. Падзейнічала. Прынцыповасць атрада спадабалася. Пасля гэтага і сталі сапраўднымі сябрамі.

— Але ж і мы ніякай работы не чураліся,— успамінае былы камандзір «Шукальніка», зараз хірург Аляксандр Васільевіч Шакуцін.— Я ніколі не падтрымліваў тых камандзіраў, якія баяліся адступіць ад дагавору: крый божа выканаць якую-небудзь (асабліва нявыгадную) работу, не абумоўленую ў дакуменце. Мы ў свой час рабілі ўсё, што неабходна было. Нават, памятаю, апалубку здымалі, поўзаючы на каленях (расцэнка — 7 капеек за метр). Тады пры неабходнасці і кіраўніцтва ішло нам насустрач.

Сёлета многія пачулі новую назву атрада, сугучную ранейшай — «Ветэраны-шукальнікі». Хто яны? Усё тыя ж студэнты пачатку васьмідзесятых. І той жа камандзір — А. В. Шакуцін.

— Ідэя стварэння такога атрада не была ні для каго нечаканасцю,— нібы стараючыся прыпомніць, калі іменна яны ўпершыню выказалі яе ўслых,— гаворыць Аляксандр Васільевіч.— Яна з'явілася тады, калі мы апошні раз працавалі ў «Шукальніку» яшчэ студэнтамі. Шкада было развітвацца (кожны ведаў, што гэта назаўсёды) з будатрадаўскай курткай, спяцоўкамі і кельмай. Яны сталі для нас нейкімі атрыбутамі жыцця. І тут хтосьці прапанаваў: а што, калі праз некалькі гадоў зноў апрануць форму байцоў і паехаць працаваць на будоўлю. Не важна куды, галоўнае — рабіць рэальную справу, прыносіць карысць. Потым, у 1987 годзе, на абласным злёце байцоў СА вырашылі дакладна: будзем фарміраваць атрад.

Нарэшце, арганізацыйныя пытанні вырашаны. Будаўнічы атрад «Ветэраны-шукальнікі» жыве, дзейнічае. Тут ўсё, як у звычайным студэнцкім атрадзе (дарэчы, ёсць у ім і студэнты — для перадачы вопыту, традыцый): напружана ідзе падрыхтоўчы перыяд, адшліфоўваюцца нумары мастацкай самадзейнасці атрадная агітбрыгада, заканчваецца выпуск насценнай газеты, абмяркоўваюцца тэмы лекцый і выступленняў.

Больш важныя клопаты ў камандзіра: хутка выязджаць на работу, а на аб'екты не поўнасцю завезены будматэрыялы, няблага яшчэ раз пераканацца, што гасцініца, у якой размесцяцца байцы, не патрабуе рамонту. Трэба сказаць, што кіраўніцтва саўгасаў 1 Мая і імя Чарняхоўскага Валожынскага раёна робяць усё, каб іх шэфы («Ветэранаў» можна так назваць, бо намеры іх разлічаны не на год: тое, што яны мараць зрабіць у гаспадарцы, за гэты час не асіліш) адчувалі сябе, як дома. Тады і работа пойдзе на лад. А яе шмат.

У дзвюх гаспадарках вырашылі пабудаваць 15 жылых дамоў, аўтагараж на 25 месц, магазін, пральны камбінат, два кароўнікі, разлічваюць яшчэ ўзвесці і дзіцячы садзік. Карацей, атрад колькасцю 70 чалавек абавязуецца цалкам выканаць праграму будаўніцтва гаспадарак. Сума асвоеных капіталаўкладанняў складзе 800—900 тысяч рублёў.

Хай не закрадзецца ў вас думка, быццам за доўгім рублём едуць на будоўлю ветэраны «Шукальніка». Хоць і гэты фактар А. В. Шакуцін лічыць не апошнім: «Наш матэрыяльны ўзровень, на жаль, не дастаткова высокі, каб ігнараваць гэтым»,— гаворыць ён.

— А калі б вам прапанавалі стварыць атрад камуністычнай працы? Вы б падтрымалі ініцыятыву?

— Не. Не раз параўноўваў вынікі работы такіх атрадаў са сваімі: нашы паказчыкі значна вышэйшыя. І яшчэ адно: мы пералічваем у розныя фонды каля 9 тыс. рублёў, а камуністычныя атрады ўсяго каля трох тысяч рублёў. Вось тады, калі мы зможам працаваць у такіх атрадах з поўнай нагрузкай, будзе сэнс іх ствараць.

...Аляксандр Васільевіч цалкам захоплены зараз даволі прывабнай ідэяй — адкрыць рахунак у банку. Першым укладам будуць грошы, зароблены на дні ўдарнай працы атрада, якія пойдуць на будаўніцтва мемарыялу медыкам — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

ПАСТСКРЫПТУМ ПРА ЛЕТА

Не патрэбай адзінай...

Мы былі прымхлівымі, калі, ад'язджаючы ў будатрад, прадбачылі горы цяжкасцей, побач з якімі фронт работ здаваўся амаль нябачнай кропкай. Такімі зрабіў нас жыццёвы вопыт. Ён бясконца нашэптваў аб спажывецкіх адносінах кіраўніцтва да будаўнічых атрадаў, прапаноўваў на выбар жыллё ў шалашы ці штодзённыя пошукі прараба на будаўнічай пляцоўцы. Але выпрацаваны стэрэатып пайшоў марна. Адміністрацыя трэста № 37 у асобе М. І. Макарэвіча і прадстаўнік прафкома В. В. Сасункевіч стварылі выдатныя ўмовы пражывання і быту. Ды й сакратар камітэта камсамола В. В. Лысенка не бачыў нічога ганебнага ў тым, што дапамагаў нашым атрадам: «Квант» Мінскага радыётэхнічнага інстытута, «Гродно-88» Гродзенскага медыцынскага інстытута, «Росинка» Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў арганізацыі дасуга, спартыўнай, культурна-масавай і экскурсійнай работы.

Мяркуючы па тым, як хутка і канструктыўна вырашаліся ўсе пытанні, што ўзнікалі ў працэсе працоўнай дзейнасці, у трэсце № 37 у час заключэння дагавораў улічвалі не толькі ўласную патрэбу ў таннай працоўнай сіле...

Ад імя байцоў падпісалі камандзіры і камісары атрадаў.

БЯЗВЫХАДНАЕ СТАНОВІШЧА.

ШТО ВЫ!

Як жа іначай можна было назваць тое, што адбывалася? Запланаваныя яшчэ на май рэстаўрацыйныя работы помніка Героям Хасана на сопцы Крыжовая знаходзіліся пад пагрозай зрыву (з-за адсутнасці падрадчыка). Да святкавання 50-годдзя Хасанскіх падзей у пасёлку Краскіне заставалася няшмат часу.

— Што вы! — супакоілі байцы атрада «Няміга» Мінскага радыётэхнічнага інстытута. І назвалі падрыхтоўку помніка да святкавання сваім Ленінскім заданнем. А ў дзень святкавання 50-годдзя разгрому японскіх мілітарыстаў ля возера Хасан разам з камсамольскімі арганізацыямі прадпрыемстваў і воінскіх часцей прымалі ўдзел у факельным шэсці да адрэстаўрыраванага помніка.

Выканаўчы камітэт Краскінскага пасялковага Савета народных дэпутатаў выражае ўдзячнасць байцам студэнцкага атрада «Няміга» за ўдзел ва ўсіх грамадскіх справах пасёлка.

З. І. БАКАРАС,
старшыня выканкома.

Няўжо яго лепей не зробім?

Школа, экзамен і мара пра рамантыку

МІХАІЛ аказаўся чалавекам камунікабельным. Адразу ж пачаў заклапочана гаварыць аб тым, што не дае спакойна жыць. Адно з важнейшых пытанняў, якія, на яго думку, патрэбна неадкладна вырашаць,— прапаганда студатрадаўскага руху.

— Вельмі добра было, калі выходзіла газета «Знамя юности» на студенческой стройке»,— працягвае размову М. Карпінчык, намеснік камандзіра Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў.— Аднак яе чамусьці прыкрылі. Зараз мяркуем аднавіць выпуск газеты. Прапануем нават узяць на сябе некаторыя фінансавыя расходы: можам, напрыклад, плаціць зарплату аднаму карэспандэнту, які б займаўся данай праблемай, фінансаваць усе затраты на канцтавары. Вельмі спадзяюся, што праблему гэту агораем. Магчыма, калі б прапаганда была больш шырокай, то не давялося б канстатаваць: прэстыж байца студэнцкага атрада ў апошні час падае, колькасць заяў рэзка змяншаецца.

— Чым быў студэнцкі атрад для цябе: экзаменам на сталасць, магчымасцю добра зарабіць, ажыццяўленнем мары пра рамантыку?

— Перш за ўсё школай сталасці, калектывізму, працоўнай загартоўкі. Таму што адносіны паміж студэнтамі ў аўдыторыі і ў атрадзе зусім іншыя. У першым выпадку кожны самастойны. У атрадзе ж наадварот: часам ад аднаго байца залежыць атмасфера, адносіны ў калектыве і, безумоўна, выкананне задання.

Другая паездка — камандзірам атрада. Былі імгненні, калі шкадаваў, што згадзіўся на гэта. Асабліва на першым часе. Пастроіў байцоў і не ведаю, што ім сказаць: з чаго пачаць і чым кончыць. Ну які я ім камандзір — гэта ж амаль усе аднакурснікі. А тут ты ўзяў на сябе адказнасць за іх. Але камандзір не мае права расчароўвацца і памыляцца. А яшчэ вельмі важна не навязваць сваю думку, а прыслухоўвацца да меркавання астатніх і рабіць высновы, зыходзячы з гэтага. А калі ты ўпэўнены, што правы, паспрабуй тактоўна і абгрунтавана адстаяць свой пункт гледжання.

— Галоўныя дзеючыя асобы ў атрадзе — камандзір і камісар. Як павінны будавацца ўзаемаадносіны паміж імі?

— Камандзір і камісар — гэта адно цэлае, цеснае звяно. У кожнага свае абавязкі: справа камісара — усталяваць добры мікраклімат у атрадзе, а задача камандзіра — арганізацыя вытворчай дзейнасці. Тым не менш яны павінны як бы дапаўняць адзін аднаго. І калі гэтага не будзе, атрада не атрымаецца.

А ён павінен атрымацца. Абавязкова. Магчыма, тады і колькасць жадаючых праверыць свае сілы і здольнасці будзе большай.

Запісала
З. АЛЯКСАНДРАВА.

ГЭТА ВЫ НЕ ПРАХОДЗІЛІ

МІЛЬЯНЕРЫ!

Іначай гэтую пяцёрку з агранамічнага факультэта Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі цяпер не называюць.

Барацьбіты за сацыяльную роўнасць і справядлівасць адразу зоймуць баявую позу: маўляў, ведаем гэтых кааператыўшчыкаў!

Яны не кааператыўшчыкі (хаця асабіста я не супраць тых, хто вялікія грошы здабывае вялікай уласнай працай) — проста студэнты, якія ўзялі ў арэнду 47 гектараў зямлі ў вучэбнай гаспадарцы БСГА.

Што для іх арэндны падрад: пагоня за грашыма ці нешта іншае?

Безумоўна, грошы цяпер адыгрываюць немалую ролю, зрэшты, мы пачалі вучыцца іх лічыць. І не толькі ў сельскай гаспадарцы. Але і адчуць сябе гаспадаром на ўласнай зямлі шмат каму хочацца. Таму, як тлумачыў мне адзін з арандатараў, студэнт 3-га курса аграфака Павел Крот, і з'явілася думка: перш чым у будучым кіраваць на пасадзе агранома, паспрабаваць новую форму працы на сабе.

Далей, здаецца, прасцей не прыдумаеш.

У пачатку пасяўной хлопцы звярнуліся ў вучгас са сваёй прапановай. Ім не адмовілі. Іх імкнуліся забяспечыць тэхнікай і пасяўным матэрыялам. На 47 гектарах былі пасеяны кармавыя буракі. А цяжкасці чакалі наперадзе. Каб атрымаць добры ўраджай, трэба было кармавыя буракі прараджваць, праполваць, уносіць угнаенні. Зрэшты, да працы звыклым нічога складанага ў гэтым няма. Ды прышлося хлопцам сутыкнуцца вось з чым.

Іх непакоіў канчатковы вынік. І таму яны працавалі сумленна, без ляноты. А тэхніка іншы раз прастойвала. Чаму? Паспрабуйце ўпэўніць механізатара ў неабходнасці рваць жылы. Яму аплочваецца гадзіна — і ўсё. Больш зрабіць ці менш — гэта яго не хвалюе. Хлопцы знайшлі выйсце. Самі садзіліся на машыну ці трактар. Такім чынам памяншалі колькасць простояў.

У выніку сабралі восенню з кожнага гектара 670 цэнтнераў кармавых буракоў. Увесь ураджай здалі дзяржаве, за што і атрымалі грошы.

Як аднесліся да поспеху ў вучгасе?

— Гэта выгадна і нам, і студэнтам,— лічыць намеснік дырэктара вучгаса па вытворчасці Мікалай Аляксеевіч Ачыпаў.— Мы здаём ім зямлю, забяспечваем неабходным насеннем і тэхнікай. Яны ж пастаянна працуюць на палетках вучгаса і атрымліваюць грошы за гатовую прадукцыю.

Наша сувязь са студэнтамі агранамічнага факультэта будзе падтрымлівацца. Напрыклад, на гэты год мы таксама заключылі дагавор з імі па прынцыпу арэнднага падраду: прадастаўляем ім 119 гектараў зямлі для вырошчвання некалькіх культур — збожжавыя, бабовыя і буракі.

Як бачым, сапраўды, выгадная справа. Тым больш, калі студэнцкая практыка дае канкрэтныя вынікі.

А як з мільёнамі? Такіх грошай хлопцы пакуль у руках не трымалі, але зарабілі няблага: на пецярых звыш 14 тысяч рублёў.

Д. МАЛІНОЎСКІ,
наш спецкар.
г. Горкі.

ПОГЛЯД

БУДАТРАД — КРУГЛЫ ГОД

Сёння пры стварэнні будаўнічых атрадаў даводзіцца клапаціцца перш за ўсё аб сумяшчэнні розных інтарэсаў. З аднаго боку, гэта турботы народнай гаспадаркі, дзе працоўныя рукі патрэбны і на кансервавых, і на цагельных заводах. А з другога — імкненне студэнтаў працаваць па пэўнай спецыяльнасці, у пэўным геаграфічным раёне і ў пэўным калектыве. Вяртаючыся да поўнай добраахвотнасці як галоўнага прынцыпу будатрадаўскага руху, прыдзецца яшчэ шмат намаганняў прыкласці, каб большасць студэнтаў зразумелі: праца ў атрадах, дзе нізкія заробкі, патрэбна не менш, чым іншая.

Добраахвотнасць як галоўны прынцып будатрадаўскага руху зусім не самамэта, і не толькі ў якасці маральнага арыенціра патрэбна яна кожнаму будатраду. Вопыт паказвае: там, дзе прытрымліваюцца гэтага прынцыпу, ёсць патрабавальнасць да сябе, унутраная дысцыпліна кожнага байца, ёсць агульны якасны вынік. Дарэчы, звычайна мы скардзіліся больш за ўсё на тых, хто забяспечвае атрады работай. Можа, добраахвотнасць фарміраванне дапаможа нам, нарэшце, патрабаваць не менш і ад саміх будатрадаўцаў?

Шчырая зацікаўленасць кожнага з членаў атрада ў поспеху агульнай справы з'явіцца толькі пры ўмове, што ва ўсім будзе сапраўдная канкурэнтнасць: і ў барацьбе за пасаду камандзіра, і пры фарміраванні атрада — заяў жа звычайна больш, чым месцаў. Безумоўна, рэальнае адзінства будаўнічага атрада з'яўляецца адначасова з першымі мазалямі, але чалавек, які прыняў удзел у выбарах камандзіра, абавязкова адчуе сябе часткай калектыву.

Прыйшоў час па-новаму зірнуць і на грамадска-палітычную работу ў будатрадах. Яна павінна быць не выкананнем таго, што даручана зверху, а адлюстраваннем жадання кожнага зрабіць нешта карыснае, дапамагчы каму-небудзь: можа, нейкім старым — па гаспадарцы спраўляцца, або дзецям, чые бацькі днямі ў полі працуюць,— гульні арганізаваць.

Не трэба старацца зрабіць усё: гэта недарэчна, калі студэнты інстытута культуры возьмуцца рачулку чысціць, бо іх справа — зачынены некалькі месяцаў клуб, правядзенне свята ўраджаю, канцэртаў. Галоўнае, каб у кожнага члена атрада ўзнікла жаданне зрабіць нешта добрае — тады і самаадчуванне ўсяго калектыву будзе станоўчае.

Многае ў будатрадах робіцца аўтаматычна, пад націскам, незацікаўлена. Таму роля камісара становіцца больш шырокай. Не толькі за выпуск газет, падрыхтоўку канцэртаў і лекцый павінен ён адказваць. Галоўнае для камісара — барацьба за сапраўднае камсамольскае братэрства, за добрасумленнасць і бескарыслівасць.

Дарэчы, бязвыплатная праца — тэма для асобнай, вельмі сур'ёзнай гаворкі. Бо сапраўдныя каштоўнасці, з якімі звязаны гэты рух, часам падменьваюцца простым жаданнем здабыць сабе пэўныя льготы. Некаторым студэнтам патрэбна існаванне самога факта, што ён працаваў у атрадзе бязвыплатнай працы. За гэта ж могуць даць стыпендыю, хоць апошняя сесія здадзена пасрэдна, або ўзнагародзіць грашовай прэміяй. Я лічу, што гэта самыя трывожныя сімптомы нашага руху.

У беларускіх атрадаў даўно існуе традыцыя ўключэння ў свае рады ганаровых байцоў. Яе трэба заўсёды падтрымліваць, хоць, вядома, ідэалаў у нас стала значна менш, чым раней. Але ж прыклады для пераймання, маральныя арыенціры ўсе роўна застаюцца. Зараз кожны атрад мае права выкарыстоўваць грошы, зароблены на імя ганаровага байца, як лічыць патрэбным. Галоўнае, каб гэта не ператваралася з дабрачыннай акцыі ў просты водкуп.

Ёсць і яшчэ адно новаўвядзенне. Раней амаль усе акцыі бязвыплатнай працы рабіліся ў Фонд Міру. А зараз кожны атрад можа рабіць свой выбар — фондаў існуе шмат.

Напрыклад, у мінулым годзе быў створаны фонд студэнцкіх атрадаў. Як размяркоўваць грошы, пераведзеныя сюды, вырашаюць Саветы пры абласных будатрадах. У гэтым годзе ў фонд пераведзена 451 тысяча рублёў, з іх расходавана пакуль 285 тысяч: куплена 7 аўтамашын для дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў, 50 тысяч пералічана для аказання дапамогі Арменіі, 36,6 тысяч — на атрадныя патрэбы (напрыклад, для арганізацыі конкурсаў і злётаў), 17,6 тысяч — на сімволіку. Яшчэ 67 тысяч рублёў пайшло на ўзнагароды перадавікам, а 12 тысяч — для абмену з замежнымі краінамі.

Праблем у будатрадаўскага руху сёння шмат. Адной з галоўных, якая закранае многія іншыя, з'яўляецца неабходнасць працаваць па фарміраванню будатрадаў увесь год, а не толькі напярэдадні працоўнага семестра. Такая паслядоўная работа адразу прынясе станоўчыя вынікі.

Л. ГУЛЮТА,
камісар Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў.

ПОСПЕХ БЕЗ ПЕРАРЫВУ

Байцоў зводных студэнцкіх атрадаў Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці першынство ў рэспубліцы не здзівіла, хоць, вядома, узрадавала. Пасля перамогі ў вобласці яны проста ўпэўнена і спакойна чакалі. «Мы — вопытныя байцы,— не без гонару сказала Таццяна Цітавец, сакратар камітэта камсамола інстытута. — Галоўныя канкурэнты ў спаборніцтве — віцебскія: медыцынскі і ветэрынарны інстытуты. З імі і спрачаемся ўжо шмат гадоў».

Удача зноў усміхнулася студатрадаўцам ВТІЛПа. Зрэшты, гэта хутчэй заканамернасць, чым шчаслівы выпадак. Дзесяць год прымяраліся да кароны пераможцаў. Іншы раз іх «сярэбраныя» ці «бронзавыя» паказчыкі ў вобласці былі вышэйшыя, чым у прызёраў рэспублікі, але вобласць прадстаўляе толькі аднаго пераможцу, таму і заставаліся байцы з тэхналагічнага ў цяні. Нават у 1986 годзе, маючы аднолькавыя паказчыкі са сваімі землякамі з медінстытута, яны волею лёсу ў чарговы раз не атрымалі лаўраў пераможцаў, уступіўшы першынство медыкам.

СВЯТЛО І ЦЕНІ ПЕРАМОГІ

Ні ўдары лёсу, ні бюракратычныя перашкоды не астудзілі пыл байцоў з ВТІЛПа. З году ў год будатрадаўскі рух у інстытуце мацнеў, бо не за паказчыкамі гналіся студэнты, не за лічбамі, не дзеля ўзнагароды і падзякі працавалі на будоўлях і калгасных палетках, у пасажырскіх цягніках і за прылаўкамі магазінаў. Галоўнае ўсё-такі — канкрэтныя справы і, вядома, рамантыка. Які ж будатрад без яе. А яшчэ — традыцыі...

У БУДАТРАД ПА КОНКУРСУ

Сёння такая звестка выклікала б недавер бадай што ў студэнтаў большасці ВНУ рэспублікі. Прэстыж і папулярнасць будатрадаўскай курткі зараз не такія ўжо і высокія. ВТІЛП гэтая хвароба нават не кранула. Болей таго, колькасць байцоў ЛСА з кожным годам расце, летась яна дасягнула небывалай дагэтуль лічбы — 550 студэнтаў, або кожны чацвёрты навучэнец інстытута. Прынцып адбору, як ні дзіўна гэта для некаторых ВНУ, таксама забыты — добраахвотны. Трапіць у такія атрады, як «Механік», «Віцьба», «Віцябчанка», «Віцьбічы», не лягчэй, чым паступіць у інстытут, і конкурс тут не меншы — 2—3 чалавекі на месца. Праўда, прайграўшых ніколі не бывае. Тым, каму не пашанцавала з гэтымі атрадамі, прапануюцца іншыя. Свята месца пуста не бывае. Сакрэт зноў жа ў моцных традыцыях. Часам улюбёнасць у будатрад носіць сапраўды фанатычны характар, і не без падстаў узнікла ў інстытуце прымаўка, што важнейшым для «втилповца» з'яўляецца летні працоўны семестр, а астатняе — толькі падрыхтоўка да яго і салодкі ўспамін. Ледзь скончыцца гарачая летняя пара, не паспеюць студэнты як след уцягнуцца ў вучэбныя клопаты, а ўжо вырашаюць, куды б гэта падацца працаваць на наступны працоўны семестр.

Кіруючыся мудрым выслоўем, рыхтуюць заявы яшчэ зімой. Загадзя вырашаюць і праблемы з вучобай. Рэктарат пайшоў насустрач студэнтам, дазволіўшы ім з мінулага года праходзіць вытворчую практыку на працягу семестра. Такім чынам, летнія месяцы цалкам прадастаўлены ў распараджэнне студэнтаў, дарога ў будатрад адкрыта. Безумоўна, пры паспяховай вучобе скідкі на «працоўныя заслугі» у інстытуце нікому не робяць — форма будатрадаўца неяк ужо абавязвае не адставаць і ў вучобе. Сярэдні бал паспяховасці, напрыклад, камандзіраў атрадаў — 4,2. А яны ж, лічы, увесь веснавы семестр ужо жывуць клопатамі пра свой атрад, рыхтуюць яго да бою. Інакш нельга, бо...





Фотаўспамін пра лета рыхтавалі С. Грыц, С. Плыткевіч.

КАМАНДЗІРЫ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ

Падрыхтоўку камандзіраў будатрадаў у інстытуце вядзе прарэктар па АГЧ Барыс Яфімавіч Рыклін, чалавек з багатым байцоўскім вопытам. Пад яго кіраўніцтвам выраслa ў ВТІЛПе сапраўдная будатрадаўская гвардыя, наладжана цэлая сістэма падрыхтоўкі студэнтаў да ЛСА. І ўсё ж, якімі б вопытнымі і мудрымі ні былі настаўнікі, лепш, чым сам будатрад, камандзіра ніхто не выхавае. І, як правіла, усе будучыя кіраўнікі атрадаў праходзяць «абкатку» радавымі байцамі ў перадавых ЛСА. Сказаць, што гэты спосаб адбору і навучання камандзіраў ідэальны, таксама нельга, многае залежыць і ад асабістых маральных, дзелавых і арганізатарскіх якасцей чалавека. Але відавочна, што іменна такая ўважлівасць да кіруючага звяна будатрада, увогуле да падрыхтоўкі, бадай што з'яўляецца самым надзейным фундаментам поспеху.

Валянціна Курбат, камандзір атрада праваднікоў «Віцябчанка», лічыць, што галоўнае — вытрымаць перыяд падрыхтоўкі. Цяжка ў час падрыхтоўкі, затое лёгка потым працаваць. Аднак нават самая дасканалая падрыхтоўка, крапатлівая вучоба, мудрыя парады і наказы не змогуць прадбачыць, прадухіліць, застрахаваць будатрад ад нечаканасцей, падказаць камандзіру выйсце ва ўсіх жыццёвых і працоўных няўвязках.

ГОРКІ АСАДАК

Будаўнічы атрад «Механік» святкуе перамогу і ў асабістым, і ў камандным заліку. Але нягледзячы на гэта, вынікам ні камандзір, ні байцы не задаволены. І аплатай іх, здаецца, таксама не абдзялілі — зарабілі хлопцы больш, чым па 1000 рублёў, а на душы застаўся прыкры, горкі асадак. Ад чаго? У першую чаргу ад усведамлення ўласнага бяссілля перад халатнасцю і абыякавасцю кіраўнікоў калгаса, у якім будавалі жывёлагадоўчую ферму. Амаль тыдзень давялося жыць студэнтам у паходных умовах і чакаць, калі ж ім дадуць магчымасць працаваць. Даводзілася спачатку займацца... рамонтам тэлевізараў у вёсцы, каб неяк пракарміць сябе. Потым крыху наладзілася праца, але ненадоўга. Раз-пораз заканчваліся будматэрыялы, і камандзір Павел Федэрака два дні літаральна не выходзіў з прыёмнай сакратара абкома. Настойлівасць камандзіра перамагла, выбіў-такі злашчасную цэглу ў Віцебску. А побач, за 2 кіламетры ад месца іх дыслакацыі, знаходзіўся цагельны завод. Ды толькі даставіць цэглу адтуль аказалася значна цяжэй, чым з далёкага Віцебска. А барацьба за цэмент з шабашнікамі ледзь не скончылася крывапраліцем.

Кіраўнікі калгаса ва ўсіх выпадках трымалі нейтралітэт, быццам не для іх гаспадаркі будавалі студэнты ферму. Кіраўнікі занальнага штаба толькі разводзілі рукамі, быццам не ў іх кампетэнцыі вырашаць падобныя праблемы. А, можа, сапраўды не ў іх?

Аднойчы за дзень у «Механіку» «гасцявала» аж сем розных праверак, а дапамагчы не змагла ні адна. «Для чаго ж яны патрэбны — штабы, кіраўнікі, камісіі, калі не маюць ні правоў, ні нават голасу,— узбуджана казаў камісар атрада Сяргей Старавойтаў.— Колькі прапаноўвалі размяркоўваць матэрыялы па неабходнасці. А то атрымліваецца: у часы пік (летам) іх не хапае, а прыйдзе пара ад'язджаць — тут, як на зло, і будматэрыялы ў калгасе з'яўляюцца. Тут ёсць два выйсця. Або надзяліць занальныя абласныя штабы сапраўднымі паўнамоцтвамі, або наогул ліквідаваць іх і даць поўную свабоду будатрадам».

ЦІ ПАТРЭБНА БУДАТРАДУ СВАБОДА?

Максімалізм байцоў «Механіка» раздзяляюць амаль усе астатнія студэнцкія атрады інстытута. Гэта і зразумела: праблема забеспячэння працай, матэрыяламі ў другіх атрадах была не менш востpай. Але ці ліквідуе яе доўгачаканая свабода выбару заказчыка і месца дыслакацыі?

Хутчэй за ўсё яна зменшыць колькасць будатрадаў, бо многія з іх не вытрымаюць жорсткай канкурэнцыі з набіраючымі сілу будаўнічымі кааператывамі і прафесіяналамі-шабашнікамі. Акрамя таго, загіне сама ідэя будатрадаўскага руху — працаваць там, дзе не хапае рабочых рук, дзе патрэбна, а не там, дзе выгадней.

З другога боку, адміністрацыйна-камандны метад кіравання часам глушыць юнацкія імкненні зрабіць больш, лепш і хутчэй. У мінулым годзе ў загадным парадку будатрады «Праметэй» і «Полымя» узводзілі Задняпроўска-Аршанскі комплекс. Апрача іх там знаходзіліся яшчэ чатыры ЛСА. І не адзін з іх не змог як след папрацаваць, усім не хапіла аб'ектаў. Але мяняць дыслакацыю было позна, і за прастоі заказчыка плаціць не прымусіш, бо фармальна заняць студэнтаў гаспадары знойдуць чым, паспрабуй толькі загаварыць аб сваіх правах. Вось і пакутавалі хлопцы ўсё лета ў пошуках работы, адпаведны атрымалі і заробак. Пасля такога «гасцепрыімства» міжволі ўзнікне жаданне ў наступны раз больш насцярожана выбіраць самім сабе заказчыка. Але наўрад ці гэта засцеражэ ад небяспекі «праколу», не ўзнікне непатрэбнай мітусні і хаосу ў пошуку выгаднага гаспадара. Каардынацыя дзеянняў будатрадаў, безумоўна, патрэбна, а значыць, без занальных і абласных штабоў не абысціся. Выйсце адно — арганізаваць іх працу па-новаму.

ЗАМЕСТ «АСАННЫ»

Выносіць смецце з хаты, ды яшчэ ў святочны дзень, не вельмі прыстойна. Але кожнае дасягненне, кожны поспех — гэта прыклад, а «втилповцам» хацелася, каб ён быў цалкам праўдзівы. Што ж, учынак варты пераможцаў.

М. ДЗЯБЕЛА,
наш кар.
Віцебск—Мінск.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
9 сакавіка
Зак. 1614.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.